Газета дзяржаўнай установы адукацыі “Грычынскі вучэбна-педагагічныкомплекс яслі-сад –базавая школа”



# Перапынак!



Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

№4
Снежань, 2021

## Чытайце ў нумары:

Акцыя "Упрыгожым свой клас" стар. 2

ШАГ "Гонар за Беларусь" стар. 3

Навагодні ранішнік стар. 4

Гульнявая праграма стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6

# Акцыя “Упрыгожым свой клас”

Новы год – самае казачнае і чароўнае свята. Дзеці  і дарослыя з нецярпеннем чакаюць яго.

Афармленне школы да новага года  - занятак, да якога мы падыходзім з асаблівай адказнасцю і стараемся ў кожны праект укласці часцінку сваёй душы.  Таму ўсе класы атрымаліся асаблівымі, прыгожымі і святочнымі.













# Школа Актыўнага Грамадзяніна

# "Гонар за Беларусь. Шлях да алімпійскіх вяршынь"



У Школе Актыўнага грамадзяніна фарміруецца гатоўнасць навучэнцаў у будучым удзельнічаць у грамадска – палітычным жыцці краіны, выконваючы грамадзянскія абавязкі, гатоўнасць самастойна прымаць рашэнні, несці адказнасцьза прынятыя рашэнніі іх наступствы. І што можа быць лепш, чым асабісты прыклад людзей, якія сваімі сіламі дасягнулі высокіх вынікаў.




На чарговым занятку з гісторыяй сваіх поспехаў навучэнцаў пазнаёміў майстар спорту міжнароднага класа па веласпорту Верамчук Яўгеній Аляксандравіч. Дзеці з задавальненнем слухалі спартсмена і задавалі шмат пытанняў, на якія Яўген Аляксандравіч адказваў займальна і цікава.



# Навагодні ранішнік
# “Запрасіла елка ў госці”

Ціха-ціха снег лажыцца
На палі і на лужок.
І пяшчотны сон мне сніцца-
Ціхі, белы, як сняжок.

Надышла зіма, а разам з ёй і пара самых чароўных святаў. Навагодні ранішнік “Запрасіла елка ў госці” праходзіў у атмасферы радасці і весялосці. Казачныя героі падарылі ўдзельнікам незабыўнае прадстаўленне з гульнямі, песнямі і танцамі.







# Гульнявая праграма “Навагодні серпанцін”



У навагоднім карагодзе
Ля ёлкі кожная сям’я.
Паміж сабой жывіце ў згодзе
Суседзі, блізкія, радня.
Што пажадаць пад Новы год
Сумленным добрым людзям?
Прыемных, казачных прыгод,
Якіх мы не забудзем.

Цяжка будзе забыць тыя прыемныя моманты, якія падаравала ўдзельнікам гульнявая праграма “Навагодні серпанцін”. Захапляльныя конкурсы і вясёлыя гульні, песні і танцы, казачныя персанажы і іх забавы, прызы і падарункі– усё гэта дало зарад пазітыўнай энергіі і бадзёрасці на ўвесь будучы год.







# Весткі з дзіцячага сада

Снежань у нас выдаўся вельмі багатым на падзеі. Мы сустракалі зіму, упрыгожвалі сваю групу, удзельнічалі ў конкурсе “Я даследчык” і вядома ж радасна сустракалі Новы год.









